ЛІТАРАТУРА:
1. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас – Мінск, 1977. – 14 т.
2. Мацюх, М. Д. Колас Якуб. / М. Д. Мацюх, М. І. Мушынскі. – Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. слоўн. у 6т., т. 3. – Мінск : Беларуская энцык., 1994. – 304 с.
3. Мушынскі, М. І. Коласазнаўства / М. І. Мушынскі. – Мінск, 1999. – 387 с.

# АСАБЛІВАСЦІ ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА

**Макавецкая К. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
Навуковы кіраўнік – Варанец В. І.

“Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы…” – гэтыя словы нашага класіка ведае, бадай што, кожны беларус. Якуб Колас – Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч – адзін з заснавальнікаў беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Шматграннасць яго таленту выявілася як у паэзіі, так і ў прозе, публіцыстыцы, у дзіцячай літаратуры. Якуб Колас па праву знаходзіцца на адным радку з Янкам Купалам. Гэта два таленавітыя чалавекі, якія нарадзіліся ў адзін год, жылі і стваралі ў адзін час, якія выпрабавалі як узлёты, так і моманты знявагі ад савецкай улады. І абодва стварылі сапраўдныя шэдэўры беларускай літаратуры.

Ужо ў 10-гадовым узросце Колас, пад уплывам баек Крылова, напісаў першы твор «Варона і ліса». У 12 гадоў стварыў першы верш «Вясна». Упершыню на беларускай мове спрабаваў пісаць падчас вучобы ў настаўніцкай семінарыі. На роднай мове былі напісаныя паэмы «Каля кастра» і «Страх», а таксама празаічны твор «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле». На жаль, гэтыя тэксты не захаваліся да нашага часу.

Паэтычная творчасць Якуба Коласа – гэта працяг дэмакратычных традыцый беларускай літаратуры мінулай эпохі. Паэт маляваў змрочную, прасякнутую сумам і жальбой карціну жыцця зняважанага і зняволенага мужыка. У яго першым вершы «Наш родны край», надрукаваным у 1906 г., і ў пазнейшых творах «Вёска», «Наша сяло», «Ворагам», «Мужык» і шмат іншых створана праўдзівая карціна старой жабрацкай Беларусі. Паэзія Я. Коласа была паэзіяй тугі і смутку. Невыпадкова свой першы зборнік вершаў паэт назваў «Песні жальбы» (1910). У ім многа лірычных, шчырых вершаў пра бацькаўшчыну, пра «забыты богам край». У 1923 годзе асобным выданнем выйшла скончаная паэма «Новая зямля», ў 1925 – 3-я рэдакцыя паэмы «Сымон-музыка», а ўжо ў 1926 Я. Колас атрымаў званне народнага паэта.

Якуб Колас адметна вылучаецца з кола паэтаў сваёй адданасцю роднаму краю, Бацькаўшчыне, служэннем свайму народу. Аднак даволі часта сустракаюцца меркаванні аб адсутнасці ў вершах паэта любоўных матываў, што, безумоўна, з’яўляецца памылковым сцвярджэннем. Вершы Якуба Коласа пра каханне ўяўляюць сабой адрасаваныя творы, у якіх абавязкова прысутнічае

Репозиторий ГрГМУ

вобраз абранніцы. Напрыклад, у вершы Якуба Коласа «Маёй Марусі» паэт звяртаецца да сваёй каханай, пры гэтым называеяе імя. Каханая ў думках Якуба Коласа параўноўваецца з самымі традыцыйнымі сімваламі: зямля, неба, што ў чарговы раз падкрэслівае неад’емнасць і патрэбу апявання навакольнай рэчаіснасці паэтам:

Яны – і неба, і зямля –
Засумавалі, можа, самі,
А ты, як дрэва без галля,
Уторыш ім іх галасамі.
А я, мой дружа, што скажу?
Калі жыва будзе Маруся,
Я выйду ў поле на мяжу,
Зямлі і небу пакланюся.
*Я. Колас «Маёй Марусі»*

Значную ўвагу Якуб Колас надае вершам-прысвячэнням, што маюць некалькі адрасатаў. Вялікае кола твораў прысвечана жонцы пісьменніка Марыі Дзмітрыеўне Міцкевіч. Адзіная думка паэта з ім у сэрцы назаўсёды – здароўе яго роднай і дарагой жанчыны. «Я радасці большай не ведаў бы ў свеце, Кааб толькі была ты здарова”, –пісаў паэт.Якуб Коласчула і гарманічна ўзнаўляе ў вершах пра каханне традыцыйныя вобразы беларускай народнай лірыкі: кветкі і зоркі. Рознакаляровая афарбоўка кветак накладае адбітак на шматфарбавую гаму пачуццяў. У вершы «М. Д. М.» Якуб Колас не ўпершыню звяртаецца да жонкі, яго каханне раскрывае душэўны стан героя, багацце яго духоўнага свету, яго хваляванні і перажыванні.

У творчасці класіка сустракаюцца любоўныя вершы, дзе няма аднаго канкрэтнаг ааб’екта пачуццяў. У вершах дадзенага напрамку прасочваецца зборны і абагулены вобраз:

Я хачу аб табе
З кім хоць слоўка сказаць,
Сэрца гора, тугу
І сумненні прагнаць.*(«Я хачу аб табе..”» (1914))*

Даўно ўжо адышла ў нябыт старая Беларусь, старая вёска з яе галоўным клопатам пра зямлю і хлеб надзённы, з усімі яе трывогамі, надзеямі і патрабаваннямі. Але якімі блізкімі і зразумелымі, дзякуючы творам Якуба Коласа, з'яўляюцца нам перажыванні простых людзей, паўсядзённы побыт сялян, іх духоўны свет! Са старонак коласаўскіх твораў вёска ажывае перад намі ва ўсіх сваіх праявах, вялікіх і малых, у сваім знешнім выглядзе (такім, якім ён быў ва ўсе поры года, пры розных абставінах), з раскрыццём маральных норм, светапогляду, уяўленняў, паводзін, жыццёвай мудрасці і заблуджэнняў яе жыхароў.

Напрыканцы хочацца ўзгадаць адну легенду пра нашых класікаў. Гэтая легенда агульная для Купалы і Коласа. Вядома, што хоць у жыцці яны і былі сябрамі, у прафесійнай сферы лічыліся канкурэнтамі. Такімі ж канкурэнтамі яны былі і за шахматнай дошкай. Янка Купала гуляў у шахматы лепш, і таму вельмі хваляваўся, калі Коласу ўдавалася выйграць. І вось, падчас адной з



Рэпазіторый ГрГМУ

партый, калі Купала відавочна прайграваў, ён пасля чарговага ўдалага ходу свайго апанента ўсклікнуў: «Ах ты, мужык!». Колас не застаўся ў даўгу і адказаў: «А ты – шляхцюк!». Завязалася бойка, усе фігуры былі змецены з шахматнай дошкі. Так Янка Купала выратаваўся ад паразы.

ЛІТАРАТУРА:

1. Зуева, В. У. Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання / В. У. Зуева [і інш.]. – М., 2021. – с. 263
2. Радкович, А. И. Особенности интимной лирики Якуба Колоса [Электронный ресурс] / А. И. Радкович. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/272944/1. – Дата доступа: 08.10.2021.
3. Климец, А. И. Пясняр долі народнай [Электронный ресурс] / А. И. Климец. – Режим доступа: http://yakubkolas.ru/pyasnyar-doli-narodnai. – Дата доступа: 08.10.2021

## РАЗВІЦЦЁ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ НА АСНОВЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

**Прэдка В. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы
Навуковы кіраўнік – к. філал. н, дацэнт Лапкоўская А. М.

Чытанне займае важнае месца ў жыцці кожнага культурнага чалавека і з'яўляецца адным з галоўных прадметаў для вывучэння на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, яно прызвана абудзіць у вучняў цікавасць да кніг, закласці асновы культуры чытання, далучыць да агульначалавечых і нацыянальных духоўных каштоўнасцей. Камп'ютарныя і іншыя інфармацыйныя тэхналогіі знізілі цікавасць сучаснага чытача да кнігі, здольнай узбагаціць унутраны свет чалавека, даць веды пра жыццё і свет, развіць самастойнае мысленне і даставіць чытачу мастацкую асалоду.

Кожны вучань можа мець поспех у тым ці іншым накірунку вучэбнай ці практычнай дзейнасці. І вядома ж, хочацца бачыць іх вучнямі, якія ўмеюць вучыцца, здабываць і перапрацоўваць атрыманую інфармацыю з розных крыніц. У сучаснай метадычнай літаратуры праблема фарміравання і развіцця чытацкіх уменняў на аснове нацыянальных культурных традыцый у вучняў на ўроках літаратурнага чытання яшчэ не знайшла належнага асвятлення. Актуальнасць выбранай тэмы даследавання абумоўлена тым, што выкарыстанне нацыянальных традыцый у навучанні школьнікаў дае магчымасць для далучэння дзяцей да народнай культуры, развівае ў вучняў уменне прымяняць прыказкі, прымаўкі, загадкі ў зносінах, фарміруе ў дзяцей культурна-этнічныя веды.

Варта адзначыць, што нацыянальныя культурныя традыцыі займаюць нязначнае месца ў сучасных праграмах пачатковай школы, хаця яны

Репозиторий ГрГМУ